## ЛІТАРАТУРА

1. Полоцкие грамоты XIII — начала XVI в. М., 1977—1982. Т. 1—4.

2. *Булыка А. М.* Даўнія запазычанні беларускай мовы. Мн., 1972.

3. *Смолина К. П.* Лексика имущественной сферы в русском языке XVI—XVII вв. М., 1990.

## SUMMARY

*The resources of nomination which sere the social and political, legal and socio-economic functional spheres, during the development of the Byelorussian language are studied on the basis of Polotsk Deeds of the 15th — the beginning of the 16th centuries. Great attention is paid to determination of the semantic body and analysis lexical units.*

УДК 483(07)

*В. І. Свірыдзенка*

# Роля вывучэння спалучальнасці слоў у развіцці мовы вучняў

У школьным курсе беларускай мовы вялікае значэнне мае вывучэнне лексічнай і граматычнай спалучальнасці слоў у сказе. Засваенне вучнямі заканамернасцяў злучэння слоў дапамагае зразумець сувязі, якія існуюць у структуры мовы. Засваенне граматыкі, а таксама выпрацоўка арфаграфічных і пунктуацыйных навыкаў немагчымы без умення ўстанаўліваць сувязь паміж словамі.

Авалоданне нормамі спалучальнасці слоў спрыяе ўзбагачэнню слоўніка вучняў, развіццю іх звязнай мовы. Канструяванне словазлучэнняў, сказаў, камунікатыўныя практыкаванні вучаць беражлівым адносінам да сродкаў мовы, у прыватнасці да слова, што «забяспечвае павышэнне моўнай культуры дзіцяці» [1, с. 3].

Вывучэнню спалучальнасці слоў, адной з «самых складаных лінгвістычных з'яў» (Н. Д. Аруцюнава), прысвечаны лінгвістычныя даследаванні В. У. Вінаградава, Б. Н. Галавіна, Г. А. Золатавай ды інш. Праблема словазлучэння ў сістэме сінтаксісу на ўсім працягу развіцця лінгвістычнай думкі цесна звязвалася з агульным разуменнем задач і прадмета гэтай навукі. Між тым задачы і аб'екты сінтаксісу, як сведчыць гісторыя мовазнаўства, вызначаліся неаднолькава. «У аснову сінтаксісу клаліся то вучэнне пра словазлучэнне і яго віды, то

вучэнне пра сказ і яго члены (галоўныя і даданыя), то вучэнне пра словазлучэнне і сказ ў іх механічным, фармальным "счапленні" або ў арганічным адзінстве і ўзаемаабумоўленасці» [2, с. 4]. У гісторыі навуковай распрацоўкі агульнатэарэтычных праблем сінтаксісу і тэорыі словазлучэння важную ролю адыграла вучэнне В. У. Вінаградава аб узаемаабумоўленасці і ўзаемасувязі розных элементаў моўнай структуры, у якіх непасрэдна або апасродкавана адлюстроўваецца ўся разнастайнасць праяўлення і шматграннасць адносін паміж прадметамі, паняццямі і з'явамі ў свеце аб'ектыўнай рэчаіснасці. Важнае месца ў агульнатэарэтычных даследаваннях вучонага займалі пытанні структурнай арганізацыі словазлучэнняў, іх будовы, складу, спосабаў і сродкаў выражэння сінтаксічных адносін паміж словамі, якія спалучаюцца, узаемадзеяння граматычных і лексічных значэнняў, формы і зместу ў словазлучэнні і сказе, прынцыпаў падзелу і класіфікацыі словазлучэнняў. Значная ўвага ў яго вучэнні ўдзялялася таксама пытанням семантычнай спалучальнасці слоў на базе іх агульных катэгарыяльных адзінак і канкрэтных лексічных значэнняў.

Праблема спалучальнасці слоў прыцягвае ўвагу і вучоных-метадыстаў (Г. А. Фамічовай, Н. І. Палітавай, Г. А. Валошанкі ды інш.), бо паняцце пра сувязі слоў вучні атрымліваюць ужо ў пачатковых класах. Аднак у методыцы навучання спалучальнасці слоў ёсць шмат пытанняў, якія застаюцца на сённяшні дзень без адказу.

Сувязі, што ўзнікаюць паміж словамі, з'яўляюцца складанымі. З аднаго боку, яны абумоўлены з'явамі навакольнай рэчаіснасці (нельга сказаць «хаджу па небе», але можна: «хаджу па зямлі»), з другога — уласна моўнымі фактарамі: здольнасцю слоў аб'ядноўвацца ў адпаведнасці з лексічным значэннем (напрыклад, выраз «секчы хутка» правільны, а «секчы ўверх» — няправільны), магчымасцямі граматычнай спалучальнасці слоў, якія належаць да розных лексіка-граматычных разрадаў (напрыклад, прыметнікі спалучаюцца з назоўнікамі, назоўнікі — з назоўнікамі, дзеясловамі).

У сучаснай лінгвістыцы выдзяляюць семантычную, лексічную, марфалагічную, марфолага-сінтаксічную, стылістычную спалучальнасць, а ў практыцы навучання найболын мэтазгодна традыцыйнае дзяленне яе на граматычную (сінтаксічную) і лексічную. Калі разглядаюцца спалучэнні граматычных форм, то звычайна ўказваюць на граматычную спалучальнасць, калі ўлічваецца лексічнае напаўненне гэтых форм — пра лексічную. Названыя віды спалучальнасці як розныя аспекты адной і той жа з'явы знаходзяцца ва ўзаемадзеянні. Для развіцця

мовы і актывізацыі слоўніка вучням неабходна засвоіць правілы выкарыстання слова, яго спалучальнасці з іншымі словамі. Гэтыя правілы заснаваны на граматычных нормах, яны залежаць таксама ад лексічнага значэння слоў, якое абумоўлівае здольнасць аднаго слова спалучацца з іншымі словамі.

У лінгвістычных даследаваннях спалучальнасць разглядаецца як агульная ўласцівасць слова (або класа слоў) спалучацца з іншымі словамі, а словазлучэнне як прыватны выпадак, дзе слова рэалізуе свае спалучальныя магчымасці.

Такім чынам, у працы са словазлучэннем важна ўлічваць:

1) яго структуру, гэта значыць словы, якія ўваходзяць у яго склад, пытанне, якое можна паставіць ад галоўнага слова да залежнага, выкарыстанне прыназоўніка (калі ён ёсць), неабходныя формы дапасавання і кіравання — склон, лік;

2) семантыку словазлучэння, якое выражае адзінае, але расчлянёнае значэнне.

Засваенню структуры словазлучэння дапамагаюць заданні: выпісаць са сказаў спачатку дзейнік і выказнік, а потым пары слоў, якія звязаны па сэнсу; выпісаць словазлучэнні, паставіць пытанні ад аднаго слова да другога; выпісаць са сказаў дададныя члены, якія адказваюць на пытанне *які? якая? якое? якія?* разам са словам, ад якога ставіцца пытанне; запісаць сказы, абазначыць стрэлкай звязаныя сэнсам словы (На зямлі шамацела жоўтае лісце); абазначыць знакам «х» галоўнае слова і стрэлкай сувязь слоў у кожным словазлучэнні. Мэтазгодна выкарыстаць наступныя практыкаванні:

1. Прачытайце сказы. Пастаўце дзеясловы ў патрэбнай форме. Выпішыце словазлучэнні з гэтымі дзеясловамі:

У пакой (зазіраць) маладзічок. Зоркі (зіхацець) у высокім небе. У ложку (спаць) Верачка. Яна (бачыць) цудоўны сон.

2. Утварыце словазлучэнні. Падкрэсліце прыназоўнікі, растлумачце, як яны пішуцца з назоўнікамі:

Выехаць (вёска, лес); выйсці (школа, клуб, лес); думаць (таварыш, сястра, кніга, фільм); смяяцца (гультай, абібока).

Для засваення семантыкі словазлучэння можна выкарыстоўваюць наступныя практыкаванні:

1. Дайце адказы на пытанні:

а) Як называецца трава, якая расла летась? — Леташняя трава.

б) Як называецца гімнастыка, якую робяць раніцай? — Ранішняя гімнастыка.

в) Як называецца цягнік, які перавозіць пасажыраў? — Пасажырскі цягнік.

2. Утварыце ад аднаго і таго ж назоўніка некалькі аднакаранёвых прыметнікаў і запішыце іх з назоўнікам, які падыходзіць па сэнсу. Напрыклад: гліна — гліняны, гліністы; гліняны гарлач, глінiстая глеба; лес — лясная, лясісты; лясная маліна, лясісты бераг.

3. Вучням даецца іменнае словазлучэнне з двух назоўнікаў; адзін з іх, што стаіць ва ўскосным склоне, падкрэсліваецца. Ад яго вучні павінны ўтварыць прыметнік і дапасаваць яго да другога назоўніка ў назоўным склоне. Напрыклад:

мыла для дзяцей — дзіцячае мыла; вуліцы горада — гарадскія вуліцы; палічка для кніг — кніжная палічка; плошча каля вакзала — прывакзальная плошча.

З утворанымі словазлучэннямі скласці сказы.

Праца са словазлучэннем у пачатковых класах павінна быць накіравана на:

1) засваенне спалучальнасці дзеясловаў і назоўнікаў з іншымі словамі;

2) папярэджванне памылак у пабудове словазлучэнняў і ўжыванні іх;

3) выпраўленне памылак у пабудаваных словазлучэннях (калі яны ёсць).

Практыкаванні са словазлучэннямі накіраваны звычайна на вырашэнне не адной, а некалькіх або ўсіх пералічаных задач. Але ў кожным асобным заданні адна з іх вырашаецца найбольш яскрава.

Засваенню спалучальнасці дзеясловаў і назоўнікаў з іншымі словамі паспрыяюць практыкаванні:

1. Напішыце слова зіма. Скажыце, якія бываюць зімы. Запішыце словазлучэнні (халодная зіма, марозная зіма, доўгая зіма).

2. Якое словазлучэнне можа служыць назвай тэмы, агульнай для прапанаваных урыўкаў? Развіць гэта словазлучэнне так, каб перадаць асаблівасці таго, што апісваецца:

а) Быў адзін з тых летніх дзён, якія бываюць, мусіць, толькі на Беларусі. Сонца пячэ моцна, а гарачыні няма: лішак яе паглынаюць і рака, і зараснікі аеру ды чароту, і густыя паплавы, і непралазны алешнік ды лазняк, і бярозы, і хвоі, і ўсялякая зеляніна, што жыве навокал, дыхае, шамаціць і запаўняе не толькі прыроду, але і душу чалавека. Не відаць людзей, не чуваць, але гоману досыць і без іх: адны конікі сваім цырыканнем могуць заглушыць усіх людзей...

Я. Маўр. Шчасце

б) Эдзік выйшаў на ганак, спыніўся і незадаволена зірнуў навакол. Зноў кепскае надвор'е, зусім не летняе, як і ўсе апошнія дні! Зноў нельга купацца!

Халодны вецер гнаў па нізкім небе вялікія цёмныя хмары. Возера было сярдзітае, неспакойнае. З шумам каціліся на бераг мутныя зялёныя хвалі з белымі грабянямі.

Хлопчык спусціўся па прыступках і пайшоў мокрай пасля дажджу сцежкай.

В. Вольскі. Першы вылет

3. Дапішыце два-тры назоўнікі і вызначце іх склон:

плыць на параходзе, ... , ... , ... . ; ездзіць на алені, ... , ..., ... . ; працаваць у школе, ... , ... , ... .

4. Складзіце словазлучэнні з дзеясловамі ісці, падысці, спыніцца і назоўнікам школа; выкарыстайце патрэбныя прыназоўнікі.

5. Да дзеясловаў падбярыце назоўнікі, складзіце словазлучэнні і запішыце:

напісаў, майструе, расце, пабудуюць. Узор: хадзіў у лес.

6. Падбярыце да дзеясловаў словы па пытаннях:

| | |
|---|---|
| паеду (куды?) ... | прайсці (што?) ... |
| прайсці (вакол чаго?) ... | абысці (каго?) ... |

7. Падбярыце да назоўнікаў патрэбныя прыметнікі, запішыце ўтвораныя словазлучэнні:

| | |
|---|---|
| яблык (які?) ... | сліва (якая?) ... |
| варэнне (якое?) ... | вішні (якія?) ... |

8. Змяніце формы слова ў словазлучэннях па пытаннях:

ляжаць (дзе?) (стол) — ляжаць на стале; прыехаць (адкуль?) (Мінск) — прыехаць з Мінска

9. Запішыце словазлучэнні са словамі, заключанымі ў дужкі. Выкарыстайце, дзе трэба, вялікую літару. Растлумачце правапіс канчаткаў:

сяло, вядро, хата, вярба (стары); вуліца, парк, вобласць (гомельскі).

10. Змяніце назоўнікі, як гэтага патрабуе сэнс:

Зямля... Яна корміць і поіць усё жывое, дае жыватворныя сокі (дрэвы і травы), (нівы і сады). На Беларусі шмат духмяных (сады), ураджайных (палі). Усё гэта вырасціў сваімі (рукі) чалавек, якога мы з (пашана) называем (хлебароб).

Папярэджванню памылак у пабудове словазлучэнняў і ва ўжыванні іх садзейнічаюць практыкаванні:

1. Складзіце сказы на аснове словазлучэнняў: далёкія пагоркі, яркае сонца, летні дзень, добры настрой.

2. Складзіце сказы на тэму «Восень». Выкарыстайце запісаныя тут словазлучэнні: цёплыя дні, асеннія кветкі, дробнае птаства, старыя дубы, шырокі гасцінец.

3. Складзіце і запішыце словазлучэнні са словамі цвёрды, цёплы, залаты так, каб яны ўжываліся ў прамым і

ў пераносным сэнсе (значэннях). Пабудуйце сказы з гэтымі словазлучэннямі.

4. З прапанаванымі дзеясловамі складзіце словазлучэнні. Замест склонавых пытанняў выкарыстайце адпаведныя назоўнікі:

дамовіцца (з кім? аб чым?); папракаць (каго? у чым?); згаджацца (на што? з кім?)

5. Дапішыце канчаткі прыметнікаў. Растлумачце іх напісанне:

а) Вячэрн... здарэнне прымусіла нас перанесці палатку ў новае месца. б) Лясн... возера здзівіла падарожнікаў казачнай прыгажосцю. в) Сін... паліто добра аблягала стройны стан Алесі. г) Летн... вільготн... надвор'е спрыяла росту маладых дрэўцаў.

Пры выкананні пералічаных заданняў настаўнік звяртае ўвагу вучняў на тое, каб дзеці правільна будавалі словазлучэнні, а на іх аснове — сказы і звязныя тэксты. Калі заўважана памылка, вучням прапануецца прыпыніцца, вярнуцца да ўтворанага словазлучэння, сказа, знайсці памылку. Калі гэта ў дзяцей выклікае цяжкасці, настаўнік дапамагае ім. Выпраўленню памылак у пабудаваных словазлучэннях (калі яны ёсць) дапаможа наступнае практыкаванне:

1. Выбярыце з адзначаных у дужках варыянтаў тыя, якія лічыце правільнымі:

а) Дзеці шчыра падзякавалі (калгаснага механіка, калгаснаму механіку) за цікавую гутарку.

б) Летам Янка пасвіў (цялят, цяляты).

Такім чынам, пры вывучэнні тэмы «Словазлучэнне» ў пачатковых класах трэба звярнуць асаблівую ўвагу на засваенне вучнямі норм спалучальнасці слоў, бо гэта спрыяе як развіццю іх звязнай мовы, так і ўзбагачэнню слоўніка.

Выпрацоўка ўмення вызначаць сінтаксічную сувязь слоў залежыць ад ведання вучнямі сутнасці пытання і правілаў выканання дзеянняў, ад сістэматычнасці і эфектыўнасці практыкаванняў.

Прапанаваную ў артыкуле сістэму практыкаванняў мэтазгодна выкарыстоўваць, працуючы з вучнямі III класа. Яна накіравана на:

1) засваенне структуры словазлучэнняў;
2) засваенне семантыкі словазлучэнняў;
3) засваенне спалучальнасці дзеясловаў і назоўнікаў з іншымі словамі;
4) папярэджванне памылак у пабудове словазлучэнняў;
5) выпраўленне памылкова пабудаваных словазлучэнняў.

## *ЛІТАРАТУРА*

1. *Волошенко А. А.* Изучение грамматической и лексической сочетаемости слов: 4—7 кл. Мн., 1988.

2. *Наркевіч А. І.* Сістэма словазлучэнняў у сучаснай беларускай мове (структурна-семантычнае апісанне). Мн., 1972.

3. *Политова Н. И.* Развитие речи учащихся начальных классов на уроках русского языка: Пособие для учителя. М., 1981.

4. Работа над предложением и связной речью в начальных классах: Сб. ст. /Сост. П. А. Грушников, В. Г. Горецкий. М., 1967.

5. *Протчанка В. У.* Шматаспектны аналіз пры вывучэнні сінтаксісу беларускай мовы: Вучэб. дапам. Мн., 1987.

6. *Фомичёва Г. А.* Работа над словосочетанием и предложением в начальных классах: Пособие для учителей. М., 1981.

## *SUMMARY*

*The article deals with problems related to lexical and grammatical correspondence of words. Exercises which help to learn the rules of word correspondence in a framework of a sentence are also included. They are aimed at enriching vocabulary of junior schoolchildren and developing their speech patterns and can be used by students and teachers during process at school.*

УДК 4(07)

*Н. Г. Алоўнікава, К. С. Мнішкур*

# НАВУЧАННЕ ЗАМЕЖНАЙ МОВЕ Ў РАННІМ УЗРОСЦЕ

Прагрэсіўная па сваёй сутнасці ідэя бесперапыннага навучання з'яўляецца найбольш актуальнай для ранняга авалодання замежнай мовай і падрыхтоўкі спецыялістаў, прызваных забяспечыць такое навучанне.

Па сутнасці, тут нават няма прадмета для абмеркавання. Яшчэ ў 1932 г. Л. С. Выгоцкі падкрэсліваў, што «эфектыўнасць авалодання замежнай мовай павышаецца па меры таго, як мы набліжаем вывучэнне да ранняга ўзросту... Дзіця ў раннім узросце ў адносінах да авалодання мовамі мае перавагу ў параўнанні з дзіцём больш сталага ўзросту».

Вывучэнне замежнай мовы ставіць перад дзіцём пытанні, якія дапамагаюць яму асэнсаваць карціну свету, лепш зразумець з'явы прыроды. Свет у вачах дзіцяці паўстае больш